Добразычлівыя і зламоўныя пажаданні як адлюстраванне традыцыйнай культуры беларусаў (структурна-семантычны, функцыянальны і лексікаграфічны аспекты)

ДОБРАЗЫЧЛІВАЕ ПАЖАДАННЕ, ЗЛАМОЎНАЕ ПАЖАДАННЕ, ПРАКЛЁН, СЛОЎНІК, МОЎНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ, АДМЕТНАЯ ЛЕКСІКА

Добразычлівыя і зламоўныя пажаданні як адлюстраванне традыцыйнай культуры беларусаў (структурна-семантычны, функцыянальны і лексікаграфічны аспекты) [Тэкст]: Справаздача аб НДР (заключ.): / БДПУ; кіраўн. Ліхтаровіч П.Д. – Мн., 2022. – 58 с., 1 дад. – Бібліягр.: С. 35-38 (31 назв.). – № ДР 20220455.

**Аб’ект даследавання:** добразычлівыя і зламоўныя пажаданні беларускай мовы.
**Мэта даследавання:** распрацоўка слоўніка добразычлівых і зламоўных пажаданняў беларускай мовы; структурна-семантычны і функцыянальны аналіз беларускіх добразычлівых і зламоўных пажаданняў на матэрыяле вуснай народнай творчасці, твораў мастацкай літаратуры, тэкстаў гутарковага стылю.
**Вынікі даследавання:** праведзены структурна-семантычны і функцыянальны аналіз беларускіх добразычлівых і зламоўных пажаданняў на матэрыяле вуснай народнай творчасці, твораў мастацкай літаратуры, тэкстаў гутарковага стылю; распрацаваны Слоўнік беларускіх добразычлівых і зламоўных пажаданняў. Удакладнены асноўныя паняцці і тэрміны. Распрацавана метадалогія даследавання беларускіх добразычлівых і зламоўных пажаданняў. Праведзена іх сістэматызацыя, выяўлены асноўныя тэматычныя групы беларускіх пажаданняў дабра і зла. Пададзена структурна-семантычная характарыстыка беларускіх добразычлівых і зламоўных пажаданняў, выяўлены асноўныя функцыі і канатацыйны патэнцыял даследуемых адзінак шляхам філалагічнага аналізу твораў вуснай народнай творчасці, мастацкай літаратуры, тэкстаў гутарковага стылю. Апісаны асноўныя моўныя асаблівасці добразычлівых і зламоўных пажаданняў. Ахарактарызавана структура слоўнікавага артыкула і прынцыпы ўкладання Слоўніка. Створаны Слоўнік беларускіх добразычлівых і зламоўных пажаданняў.
**Рэкамендацыі па ўкараненні** вынікаў НДР: асноўныя вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў вучэбным працэсе пры выкладанні дысцыплін “Сучасная беларуская літаратурная мова” (раздзелы “Лексікалогія”, “Фразеалогія”), “Культура маўлення”, “Этналінгвістыка”, “Лінгвакультуралогія”, пры напісанні курсавых, дыпломных і магістарскіх работ студэнтамі УВА Рэспублікі Беларусь.